УДК 930 (476):282

# “АБ АДЗІНСТВЕ ЦАРКВЫ БОЖАЙ” П. СКАРГІ І ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ ТРАДЫЦЫЯ XIX ст.

**Барсук Алена Яўгеньеўна,**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна
(г. Мазыр, Беларусь)

*Вызначэнне значэння і ўплыву творчай спадчыны П. Скаргі, у тым ліку і працы “Аб адзінстве Царквы Божай” на фарміраванне гістарыяграфічных накірункаў у гісторыі канфесійных адносін у Рэчы Паспалітай.*

Пётр Скарга – вядомы дзеяч Контрэфармацыі ў Рэчы Паспалітай, езуіт, прапаведнік і пісьменнік-палеміст, прыхільнік грэка-каталіцкай уніі, першы рэктар Віленскай езуіцкай Акадэміі, пакінуў значную творчую спадчыну. Найбольш пашыраным яго творам была праца “Аб адзінстве Царквы Божай”. Праца выклікала абурэнне праваслаўных, і першае выданне кнігі 1577 г. было выкуплена “багатай Руссю” і знішчана. Наступныя выданні выйшлі ў 1590 г. і 1610 г. Асноўныя тэзісы гэтага твора неаднаразова выкарыстоўваліся ў каталіцка-ўніяцкай палеміцы ў XVII–XVIII стст. і замацаваліся ў польскай заходнееўрапейскай гістарыяграфіі XIX–XX стст.

Сёння найбольш вядомыя два выданні XIX ст. – ў 1882 г. Імператарскай археаграфічнай камісіяй Міністэрства народнай асветы ў серыі “Русская историческая библиотека” пад назвай “О единстве церкви) і ў 1885 г. у Кракаве ў зборніку разам з іншай папулярнай працай “Sinod Brzeski i Obrona Sinodu Brzeskiego”(захоўваецца ў Гарвардскай бібліятэцы) [1, с. 2]. Гэтыя выданні яскрава адлюстроўваюць два супрацьлеглыя накірункі ў гістарыяграфіі ўніяцтва – праваслаўны і каталіцка-ўніяцкі.

Выданне Археаграфічнай каміссій не ўтрымлівае разгорнутых прадмовы і каментарыяў, але тэкст “Аб адзінстве…” выдадзены ў зборніку разам з іншымі праваслаўнымі палемічнымі творамі “Вопросы и ответы православному з папежником”, 1603 г. і О единой истинной православной вере и святой соборной апостольской церкви, откуда начало приняла и како повсюду распростреся” 1588 г. Астрожскага святара Васілія, таксама “Апокризис Христофора Филалета”. На думку рэдактара выдання П. Гільтэбрандта, менавіта гэтыя творы вызначаюць “разность между православием и римско-католичеством, причем истина православия весmма осязательно доказана”, “вразумительно” разгледжаны дагматы аб зыходжанні Духа Святога, першынстве Рымскага папы, апраўданні і адпушчэнні грахоў, (пургаторыі), сакраментах і абрадах, календары [1, с. 5, 7].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Кракаўскае выданне 1885 г. стылыстычна больш адаптавана да патрэб чытача XIX ст. У гэтым сэнсе аўтар прадмовы да працы ксёндз Станіслаў Залескі адзначаў каштоўнасць расійскага выдання як больш поўнае, што ўтрымлівала першапачатковы тэкст Скаргі 1577 г. і т.зв. “Новыя артыкулы” 1590 г. Яго прадмова тлумачыла чытачу неабходнасць канфесійнай еднасці, выкліканай Рэфармацыяй, міжканфесійнай барацьбой і крызісам праваслаўнай царквы, палітычнымі абставінамі ў Рэчы Паспалітай [2, s. V–VI]. С. Залескі падтрымаў вядомы палемічны тэзіс аб немагчымасці Канстанцінопаля (Царграда) кіраваць усходнім хрысціянствам з-за падпарадкаванасці туркам (ворагам усіх хрысціян) і зацікаўленасці ў матэрыяльнай падтрымцы. Менавіта гэтыя акалічнасці абумовілі ўтварэнне Маскоўскага патрыярхату ў студзені 1589 г. падчас візіту Царградскага патрыярха Іераміі ІІ. Ён меў патрэбу ў грашах, каб заплаціць султану Амурату ІІІ за сваё прызначэнне, але падтрымкі не знайшоў ні ў Кіеве, ні ў Вільні, таму склаў мітрапаліцкі сан з Анісідора Дзевачкі за тое, што не здолеў заплаціць 14000 злотых і прысвяціў на гэтую пасаду Міхаіла Рагозу [2, s. XI]. Па версіі Львоўскага праваслаўнага брацтва, якой прытрымлівалася афіцыйная расійская гістарыяграфія XIX ст., Анісідор страціў сан за “двоеженства” і парушэнне царкоўных канонаў. За патрэбныя грошы Іерамія прызначыў мітрапаліта Маскоўскага Іова патрыярхам Уладзімірскім, Маскоўскім, усея Русі і паўночных краёў. С. Залескі сцвярджаў, што гэтая падзея сведчыла аб адмаўленні ўлады Царградскага патрыярха на рускай царквой. “Быў ужо Рым лацінскі і Рым грэчаскі; Іерамія стварыў Рым трэці, славянскі”, які неўзабаве напомніць аб сваім праве вяршэнства над Руссю, у той час як цар, маючы тытул самадзержца Усёй Русі, шукаць будзе праў на спадчыну ад князеў Русі Уладзіміра і Яраслава. Так, руская схізма стала пякучай (вострай) праблемай, якую патрэбна было як можна хутчэй вырашаць” [2, s. XI].

Пётр Скарга растлумачваў неабходнасць рэлігійнай уніі і шкоднасць “схізмы” (расколу, або адшчапенства грэкаў), апекаваць школы і друкарні, перакладаць на польскую або “рускую” мову карысныя кнігі, займацца дабрачыннасцю. Ён заклікаў праваслаўных вярнуцца да рашэнняў Фларэнтыйскага сабору 1439 г., пагадзіцца з “нязначнымі” ўмовамі (прызнаць дагматы каталіцтва) і прыйсці да згоды. На думку Скаргі, вольнасць (шляхецкія прывілеі ўвогуле і свабода веравызнання ў прыватнасці) “ператварылася ў свавольства і распусту. Паслушэнства няма ні ў станах: ні каралям, ні радам яго, ні праву, ні сеймавым пастановам, ні гетманам, ні ротмістрам служыць не хочуць. Беспакаранасць злосць памножыла”. Выйсце ён бачыў ва ўмацаванні каралеўскай улады і ўсталяванні царкоўнага адзінства ў дзяржаве, бо міжканфесійная барацьба нязгоды ў Рэчы Паспалітай множыць [2, s. 3–4]. У адпаведнасці з гэтымі мэтамі “Аб адзінстве Царквы” мела адпаведную структуру і складалася з трох частак. Першая – змешчала теалагічнае абгрунтаванне царкоўнага адзінства, карыснага не толькі для грэкаў, але і для ерэтыкоў (пратэстантаў), другая – адказвала на пытанне чаму грэкі аддзяліліся ад адзінства, трэцяя – распавядала “аб звычаях, сувязі і неабходнасці аб'яднання, асабліва царквы рускай пад адзіным Госпадам і ў адной Рэчы Паспалітай”.

Менавіта Грэкі (праваслаўныя ) адышлі ад адзінай царквы, “забылі пра Божую любоў, пагарду, безпрычынныя крыўды на Рымскую царкву чынілі, і так перад



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іншымі народамі свайго веравызнання Рымскую каталіцкую веру ад слаўнага апостала святога Паўла ганьбілі. Так, у Маскве няма больш агіднага чалавека, чым Лацінік (каталік), цэрквы свае, у якія заходзіў Лацінік, зноў асвячаюць” [2, s. 125].

Сутнасць прапаноў П. Скаргі вызначалася разуменнем адзінства Царквы ў заходняй традыцыі як Сусветнай царквы з прынцыпамі адзінаўладдзя Рымскага папы, жорсткай іерархіі ў арганізацыі Царквы, адсутнасці ерасяў і іншадумства. Адсюль вынікала выснова аб прыярытэце інтарэсаў духоўнай улады над свецкай, якія лічацца вечнымі, а інтарэсы дзяржавы часовымі. Ва ўсходняй традыцыі Сусветная царква разумелася як Саборная (у сэнсе прыняцця рашэнняў на царкоўных Саборах) і адсутнічала жорсткая іерархія. Розніца ў трактоўках выклікала шырокую палеміку каталіцкіх, праваслаўных і ўніяцкіх аўтараў. Адсутнасць шырокага абмеркавання умоў царкоўнай уніі выклікала непрызнанне рашэнняў Берасцейскага сабору 1596 г., абвастрэнне міжканфесійнай барацьбы і насаджэнне ўніяцтва зверху. Праваслаўная традыцыя разглядала пашырэнне уніі як дыскрымінацыю праваслаўных, якія вымушаны шукаць паратунку ў “адзінавернай Маскве”. Аргументамі на карысць адзінства таксама былі: пашыранае сярод праваслаўнага святарства невуцтва, выкарыстанне не заўсёды зразумелай царкоўнаславянскай мовы, шлюб духавенства і залежнасць яго ад свецкіх асоб, што не дазваляюць дасягнуць сапраўднай духоўнай навукі.

Такім чынам, творчая спадчына П. Скаргі акрэсліла не толькі неабходнасць і сродкі дасягнення канфесійнай уніі, але і вызначыла гістарыяграфічныя накірункі вывучэння ўніяцтва ў Рэчы Паспалітай з супрацьлеглымі ацэнкамі вынікаў Берасцейскага сабору 1596 г.

## Літаратура


1. Скарга, П. О единстве церкви / П. Скарга // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Тип. А. М. Котомина, 1882. – Кн. 2. – Стб. 223–526. – Русская историческая библиотека, издаваемая археогр. комиссиею. – Т. 7.

2. Scarga, P. O jednosci Kosciota Bozego pod jednym pasterzem y o greckim od tey iedności odstąpieniu. Sinod Brzeski i Obrona Sinodu Brzeskiego. / P Scarga. – Krakow w drukarni «Czasu» fr. Kluczyck1ego i sp. pod zarządem Józefa Łakocińskiego, 1885. – S. 9–224.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова